УДК 94 (476): 71

*А. П. ПЯТРОЎ-РУДАКОЎСКІ*
*УА «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі»*

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЕ АБЛІЧЧА ВУЛІЦ ГОМЕЛЯ З ДАВАЕННЫХ ЧАСОЎ І ДА СУЧАСНАСЦІ

*Да сённяшняга часу ў Гомелі можна знайсці аб'екты, якія з'яўляюцца гістарычнымі сведкамі развіцця горада ў пачатку і першай палове XX стагоддзя. Яны дапамагаюць нам уявіць, як выглядаў горад у тыя гады, якім быў дабрабыт гаражанаў, іх эстэтычны густ, як складаліся эканамічна-прававыя зносіны. У якасці такіх аб'ектаў у кантэксце гэтага даследвання прапануецца коратка прааналізаваць гісторыю некалькіх жылых дамоў, захаваных на старых вуліцах горада яшчэ з дарэвалюцыйных часоў і перажыўшых вайну і пазнейшыя перамены ў гарадскім жыцці.*

Своеасаблівасцю горада Гомеля з'яўляецца тое, што сфармаванае ў даваенныя і нават у дарэвалюцыйныя часы, ягонае абліччa збераглося да нашых дзён у адносна пазнавальным выглядзе (хаця знішчальныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны не пашкадавалі Гомель, а пазней была яго адбудова, якая пацягнула і пашырэнне гарадскіх межаў). Адбылося гэта дзякуючы захаванню ў горадзе сектара прыватнай забудовы, доля якога – адна з найбольшых, калі параўноваць буйныя гарады – абласныя цэнтры. Сёння, нягледзячы на частковы знос даваеннай і пазнейшай забудовы і на рамонт жылля гаспадарамі, які часта мае радыкальны характар, застаецца яшчэ магчымасць вывучыць асаблівасці забудовы вуліц горада першай паловы XX стагоддзя і зрабіць высновы як аб асобных аспектах сацыяльна-культурнага, так і эканамічнага развіцця горада ў тыя часы.

Як вядома, будаўніцтва чыгункі ў XIX стагоддзі значна змяніла не толькі выгляд, але і лёс горада, а таксама садзейнічала з'яўленню новых, гаворачы сучаснай мовай, мікрараёнаў, адным з якіх стаўся гэтак званы «залінейны». Менавіта ён варты асаблівай увагі ў кантэксце гэтага даследвання, таму што ён адметны найбольшай

колькасцю і захаванасцю асобных гістарычных аб’ектаў, вуліц з іх абрысамі, межамі, і ў некаторых выпадках – першапачатковымі назвамі. Калі ў былыя часы галоўную ролю ў гэтай частцы горада мела вуліца Ляшчынская як адна з вядучых транспартных артэрый [2], то паступова гэтыя ролі змяніліся, і пазней у ліку такіх вуліц можна было вылучыць яшчэ некалькі значных, напрыклад, Маскоўскую, імя Ф. Дзяржынскага (колішняя Захар'еўская [3, с.184]), імя М. Горкага (колішняя Ўладзімірская [3, с.184]).

Аналіз наяўнай на сёння даваеннай забудовы гэтых вуліц паказвае, што сярод звычайных драўляных дамоў сустракаліся мураваныя, якія сведчаць аб заможнасці іх гаспадароў тых часоў. Улічваючы абмежаваны фармат дадзенага даследвання, не будзем ставіць мэтай падрабязна раскрыць гістарычныя аспекты ўсіх тамтэйшых забудоваў. Але найбольшую ўвагу ўяўляецца неабходным засяродзіць на некалькіх канкрэтных аб’ектах, па адным з якіх гаспадарамі была захаваная значная частка дакументаў. У якасці гэтага аб’екта разглядаецца дом, які па сённяшні дзень трымае свой аўтэнтычны, першасны выгляд, а ягоны своеасаблівы дэкор робіць пазнавальнай вуліцу Дзяржынскага, на якой ён месціцца і адначасна пераносіць не толькі даследчыка гісторыі горада, але і звычайнага абываценя ў далёкія даваенные часы, калі атмасферу горада вызначалі падобныя будынкі.

На малюнку 1 можна ўбачыць сучасны выгляд дома № 56-б (у 1940-я гады – № 52), а на малюнку 2 – яго ж у 1949 годзе.



Малюнак 1 – Дом № 56-б на вул. Ф. Дзяржынскага у 2015 г.



Малюнак 2 – Гэты ж дом у 1949 г.

На жаль, з кожным днём штосці страчваецца з элементаў канструкцыі і дэкора дома. Так, на леташным фотаздымку (гл. малюнак 1) можна ўбачыць захаваўшыяся арыгінальныя складныя аканіцы, а сёлета яны ўжо зніклі.

Згодна з дакументамі дом быў пабудаваны яшчэ ў 1905 годзе. У тэхнічным пашпарце (1949 год) адзначаецца, што ён падзяляецца на дзве амаль роўныя часткі.

Сёння цяжка меркаваць, ці планавалася гэта першапачаткова, аднак па схеме ў пашпарце (малюнак 3) бачна, што памяшканні дома і печы адбудаваны сіметрычна адносна цэнтральнай папярэчнай восі дома, да таго ж, месца яе праходжання адзначана звонку дома дэкараванай пілястрай, таму цалкам верагодна, што яшчэ пры пабудове дом меркаваўся як двухкватэрны. Пытанне застаецца ў тым, ці сапраўды існавалі ў дарэвалюцыйны час, калі дом быў пабудаваны, падобныя прыклады камунальнага жылля, разлічаныя на некалькі сем’яў, або памяшканні дома былі перапланаваныя ўжо пазней, у 1930-я гады, у адпаведнасці з новымі патрабаваннямі тагачаснай жыллёвай палітыкі? Аб першых гаспадарах абодвух частак дома даваеннага часу інфармацыю адшукаць не атрымалася.



Малюнак 3 – План дома ў 1949 г.

Згодна з наяўнымі дакументамі адна частка дома атрымала свайго ўласніка напярэдадні пачатку вайны, ў красавіку 1941 года, ў адпаведнасці з дагаворам куплі, а другая частка – у лістападзе 1945 года ў адпаведнасці з дагаворам дарэння (малюнкі 4 і 5).



ТЕХНИЧЕСКИЙ ПАСПОРТ
НА ДОМОВЛАДЕНИЕ

район 2 квартал 293 участок 11

Адрес домовладения Дзержинского Переулок / Улица / Площадь № 52

Владелец Шавельский Александр Осипович ½, и Милич Федор Павлович ½ часть.

Шавельская Нина Александровна ½.

Основание владения Договор дарения от 9/XI-1945 г. за № 12612 и Договор купли от 24/IV-1941 г. за № 5434.

Договор дарения доли домовладения от 18 V-55 г. Г 1311а

Утверждено комиссией Горисполкома

Акт № 1 „21" февраля 1949 г.

Инвентаризация строений и регистрация земель проведены на основании постановления Совета Министров БССР от 24 апреля 1946 г. № 648.

Оценка строений проведена на основании Инструкции НКФ СССР от 11 июня 1939 г. № 335/125.

Зав. Коммунальным отделом /Дятлов/

Нач. Инвентаризационно-технического бюро /Плехов/

„24" февраля 1949 г.

№ по реестру 55

Малюнак 4 – Копія тэхнічнага пашпарта



Договор

Дарения строения. Город Гомель.

Подпись—Павельской Ульяны.
Павельского Григория Осиповича
Павельского Александра Осиповича

Экземпляр II.

1945 года Ноября 10 дня. Настоящий договор нотариально удостоверен мной, МИРЕНЕЦ Н.И. государственным нотариусом Гомельской нотариальной конторы

Малюнак 5 – Копія дагавора дарэння

У далейшым, за сем дзесяцігоддзяў, дом неаднойчы змяніў уладальнікаў, аднак важным з’явілася тое, што знешні выгляд дома, уключаючы дробныя дэталі, захаваўся. Значны гістарычны інтарэс мае тэхнічная экспертыза дома, зробленая ў сакавіку 1946 года.



ТЕХНИЧЕСКОЕ ОПИСАНИЕ, ОЦЕНКА СТРОЕНИЙ И СООРУЖЕНИЙ

| 1 | 2 | 3 | 4 Год постройки | 5 Этажность | 6 Материал: фундамент | 7 капитальн. стены | 8 крыша | 9 Размеры: длина | 10 ширина | 11 площ. в кв. м. | 12 высота | 13 объём в куб. м. | 14 Строительная стоимость (в руб.) | 15 % износа | 16 Действительная стоимость (в руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 17.03.46 | [illegible] | основное строение | 1905 | 1 | кирпич | брев. обшивкой | железн | 11.75 | 6.10 | 71.70 | 3.40 | 244 | 14974 | 53 | 7038 |
| | [illegible] | сени | | 1 | дерев | дощат | железн | 2.40 | 5.90 | 14.20 | 2.60 | 37 | 692 | 50 | 346 |
| | [illegible] | сени | | 1 | дерев | дощат | железн | 2.10 | 4.05 | 8.50 | 2.60 | 22 | 482 | 50 | 241 |
| | [illegible] | погреб | | 1 | | кирпичн | | 2.20 | 2.20 | 4.80 | 2.00 | 10 | 633 | 40 | 380 |
| | [illegible] | погреб | | 1 | | кирпичн | | 2.40 | 2.00 | 4.80 | 2.00 | 10 | 633 | 40 | 380 |
| | | Итого по основному строению | | | | | | | | | | | 17414 | | 8385 |
| | 2г | сорай | | 1 | дерев | бревен | толев. | 3.90 | 5.40 | 21 | 2.00 | 42 | 1168 | 5 | 1110 |
| | 3г | сарай | | 1 | дерев | дощат | тесов. | 5.00 | 3.60 | 18 | 2.00 | 36 | 702 | 30 | 491 |
| | 4г | уборная | | 1 | без постоянного выгреба | | | 1.00 | 1.00 | 1.00 | 2.00 | 2 | 180 | 30 | 126 |
| | 5г | уборная | | 1 | без постоянного выгреба | | | 1.00 | 1.00 | 1.00 | 2.00 | 2 | 180 | 40 | 108 |
| | 6г | сарай | | 1 | дерев | дощат | тесов | 4.30 | 4.25 | 18.30 | 2.00 | 37 | 722 | 30 | 505 |
| | | Итого по служебным строениям | | | | | | | | | | | 2952 | | 2340 |
| | | ворота | | | | дощат | | 3.20 | | 8.30 | 2.60 | | 150 | 5 | 143 |
| | | забор | | | | дощат | | 18 | | 36 | 2.00 | | 295 | 15 | 251 |
| | | забор | | | | дощат | | 39 | | 78 | 2.00 | | 304 | 5 | 89 |
| | | забор | | | | дощат | | 16 | | 32 | 2.00 | | 125 | 30 | 88 |
| | | Итого по надворн. сооружениям | | | | | | | | | | | 874 | | 571 |
| | | Всего по домовладению | | | | | | | | | | | 21240 | | 11296 |

Составил: (Протасова)

Проверил: (Болоукин)

Малюнак 6 – Інфармацыя аб тэхнічнай экспертызе дома ў 1946 г.

На той момант узрост дома складаў 41 год, пры гэтым ягонае зношванне (фізічнае) было ацэнена ў 53 % (малюнак 6). Калі меркаваць, што яно вызначалася не толькі ў адпаведнасці з фактычным станам збудавання, але і з запланаваным тэрмінам яго эксплуатацыі, то разлікі паказваюць, што ўжо напачатку 1980-х гадоў ён цалкам павінен быў вычарпаць наканаваны час свайго «жыцця», аднак і ў 1980-я гады, і яшчэ праз траціну стагоддзя ад гэтага часу дом з'яўляецца жылым, не спазнаўшы сучаснай мадэрнізацыі, якая часта, на жаль, згубная для першапачатковага аблічча будынкаў першай паловы XX стагоддзя.

Вяртаючыся да пытання стану будынка, варта адзначыць, што на момант ацэнкі быў вызначаны будаўнічы (першапачатковы) кошт, які складаў, па цэнах 1946 года, 14974 рублі, а дзейны (рэштавы, з улікам зношвання) кошт складаў 7038 рублёў. Трэба зрабіць удакладненне наконт таго, які рэальны змест мелі гэтыя грошы на той перыяд. Па некаторых ацэнках сярэдні заробак у месяц у СССР у 1946 годзе складаў каля 520 тагачасных рублёў [4]. Калі не зважаць увагі на хібы, што маюць сярэднія паказчыкі заробку (і таксама мясцовыя асаблівасці яго разліку для кожнай з саюзных рэспублік), можна сцвярджаць, што рэштавы кошт гэтага дому складаў каля 14 сярэдніх заробкаў за месяц, а першапачатковы кошт (што аналагічна будаўніцтву новага адпаведнага аб'екта) – каля 27 сярэдніх месячных заробкаў. Агульны першапачатковы кошт домаўладання, уключаючы ўсе гаспадарчыя пабудовы, складаў 21240 рублёў, або 41 сярэдні месячны заробак 1946 года, прычым, нагадаем, што ўсе збудаванні былі разлічаныя на дзве сям'і. Такім чынам, калі параўнаць гэтыя лічбы з сучаснымі, і зрабіць папраўку на гістарычныя абставіны, можна сцвярджаць, што ў тыя пасляваенныя гады пабудова жылля для насельніцтва абыходзілася ў некалькі разоў танней.

Яшчэ адным прыкладам, вартым увагі, можна лічыць дом, што знаходзіцца непадалёку, на вуліцы М.Горкага, 41 (малюнак 7).

Гэты дом, збудаваны ў 1902 годзе, адрозніваецца шчодрым дэкорам, не характэрным для іншых дамоў у гэтай частцы горада, але мае шмат падобнага з некалькімі вядомымі помнікамі архітэктуры, што знаходзяцца ў цэнтры Гомеля. Лёс гэтага прыгожага будынка, што дайшоў да нашых дзён, мог скласціся трагічна: па словах ягонай гаспадыні, ў часы Вялікай Айчыннай вайны на гэтай вуліцы, зусім блізка ад дому ўзарвалася бомба, ад чаго ў ім з’явілася заўважная

расколіна. Аднак за семдзесят гадоў яна не павялічылася і паступова была затынкавана, затое ёсць сямейная легенда і таксама дадатковая нагода падзівіцца майстэрству колішніх муляроў, збудаваўшых такі трывалы будынак [1].



Малюнак 7 – Дом № 41 на вул. М. Горкага ў 2014 г.

На суседніх вуліцах можна сустрэць яшчэ некалькі дамоў такога ж паважанага веку, якія сваім выглядам дапамагаюць змадэляваць аблічча вуліц даваенных часоў, але, на жаль, не заўсёды новыя гаспадары дакладна ведаюць гісторыю сваіх дамоў, не захоўваюць старыя дамавыя кнігі і іншыя цікавыя дакументы, што памяншае магчымасці для аб’ектыўных гістарычных даследванняў.

У якасці высновы неабходна адзначыць наступнае. Летапісная гісторыя Гомеля налічвае амаль дзевяць стагоддзяў, аднак дзякуючы спрадвечным войнам і розным перыпетыям на тутэйшай зямлі засталося вельмі мала матэрыяльных сведчанняў і аб’ектаў з той глыбокай даўніны. Таму нават і стагадовыя дамы, і больш дробныя артэфакты маюць вялікі гісторыка-культурны кошт. І апісаныя дамы даюць сёння магчымасць вызначыць асобныя рысы сацыяльна-культурнага

аблічча горада пачатку мінулага стагоддзя і захаваць гэтую інфармацыю для нашчадкаў.

Таксама прыношу шчырую падзяку гаспадыням згаданых у артыкуле дамоў Таццяне Іванаўне Буйневіч і Натальі Сямёнавай (Савасцьянавай) за прадстаўленую інфармацыю і дакументы.

Спіс літаратуры

1 **Пятроў-Рудакоўскі, А.П.** Пра што маўчаць старыя брамы / А.П. Пятроў-Рудакоўскі // Советский район. – 2014. – 13 вер. (№ 38). – С. 10–11.

2 **Пятроў-Рудакоўскі, А.П.** Вуліца Ляшчынская: былое і сучаснасць / А.П. Пятроў-Рудакоўскі // Советский район. – 2014. – 10 снеж. (№ 50). – С. 10–11.

3 **Рогалев, А.Ф.** От Гомеюка до Гомеля: Городская старина в фактах, именах и лицах / А. Ф. Рогалев. – Гомель : Белорусское Агентство научно-технической и деловой информации, 1993. – 216 с.

4. Средние зарплаты в России и СССР с 1897 по 2010 годы [Электронный ресурс] // Аналитический клуб – Школа информационного анализа и управления. – Режим доступа: http://analysisclub.ru/index.php?page=schiller&art=2757. – Дата доступа: 28.04.2016.